ІНФАРМАЦЫЙНЫ ЛІСТ

Віцебская абласная бібліятэка запрашае прыняць удзел у **X навукова-практычнай канферэнцыі «Віцебскі край» (да 1050-годдзя г. Віцебска і 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў).**

**Арганізатары канферэнцыі:**

Дзяржаўная ўстанова «Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна»

Дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»

Дзяржаўная навуковая ўстанова «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»

Установа культуры «Віцебскі абласны краязнаўчы музей»

**Дата правядзення:** *21–22 лістапада 2024 года*

**Месца правядзення:** ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна» (Рэспубліка Беларусь, г. Віцебск, вул. Леніна, д. 8а)

**Праблемнае поле канферэнцыі:**

- Віцебская вобласць у кантэксце гісторыі краіны
- Гісторыя Аршанскага і Віцебскага акруговых таварыстваў краязнаўства (да 100-годдзя ўтварэння)
- Уз'яднанне Віцебшчыны з Беларуссю (да 100-годдзя ўз'яднання)
- Гісторыя і культура Падзвіння (ад старажытнасці да сучаснасці). Крыніцы па гісторыі Падзвіння
- Малая радзіма: гісторыя родных мясцін
- Гістарычнае краязнаўства
- Этнаграфія і фальклор
- Літаратуразнаўства і мовазнаўства
- Праблемы архівазнаўства і археаграфіі
- Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства
- Музейнае краязнаўства
- Экскурсійная справа і краязнаўства
- Царкоўнае краязнаўства
- Краязнаўства ў вучэбна-выхаваўчым працэсе

**Мовы канферэнцыі:** беларуская, руская

**Умовы ўдзелу:**

Для ўдзелу ў канферэнцыі неабходна не пазней за **22 кастрычніка 2024 года** накіраваць на электронны адрас аргкамітэта **kray@mail.vlib.by** тэкст даклада, а таксама заяўку з указаннем наступных звестак:

- прозвішча, імя, імя па бацьку;
- вучоная ступень, званне;
- месца работы, пасада;
- тэлефон з указаннем кода горада;
- e-mail;
- тэма даклада;

- форма ўдзелу (вочная ці завочная);
- патрэба ў зборніку матэрыялаў канферэнцыі (колькасць экзэмпляраў для набыцця).

**Даючы гэтыя звесткі, удзельнік канферэнцыі тым самым пагаджаецца на апрацоўку персанальных даных.**

*Аргкамітэт пакідае за сабой права адбору дакладаў для ўдзелу ў канферэнцыі і артыкулаў для апублікавання.* **Аргкамітэт не тлумачыць прычыны магчымага адхілення заявак і тэкстаў дакладаў.**

*Плануецца выданне зборніка.* Друкаваны варыянт зборніка будзе распаўсюджвацца па сабекошце па папярэдняй замове, пададзенай пры рэгістрацыі ўдзельнікаў канферэнцыі. Электронны варыянт будзе размешчаны на афіцыйным сайце Віцебскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна ў фармаце, даступным для спампоўвання.

**Патрабаванні да афармлення дакладаў:**

1. Прозвішча, імя, імя па бацьку (поўнасцю) аўтара /суаўтара, горад, краіна, назва даклада.

2. Аб'ём даклада з ілюстрацыямі і дадаткамі – не больш за 7 старонак фармату А4, Times New Roman, 13 кегль, палутарны міжрадковы інтэрвал, тып файла – doc ці rtf (Microsoft Word). Палі – 25 мм з усіх бакоў. Абзацны водступ – 1,25 см.

3. Спіс выкарыстаных крыніц афармляецца пасля асноўнага тэксту **ў алфавітным парадку**.

4. Тэксты дакладаў неабходна даслаць у электронным варыянце ў рэдактары MS Word.

**Патрабаванні да электронных прэзентацый:**

- Тып файла – ppt Microsoft Power Point

**Каардынатары:**

**Рагачова Ларыса Іванаўна**,

загадчык аддзела краязнаўства Віцебскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна

Тэлефоны: +375 (212) 67 49 11

E-mail: **kray@mail.vlib.by**

**Бараноўскі Аляксандр Віктаравіч**,

намеснік дырэктара па навуковай рабоце Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук

E-mail: **a.baranouski@belcentre.by**

**Перавалава Наталля Юр'еўна,**

вучоны сакратар Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат філалагічных навук

E-mail: **n.peravalava@gmail.com**